

Анатолій Маркевіч узнагароджвае Алену Астапаву



Віктар Лясковіч узнагароджвае Марыну Чарнышову



Ігар Марзалюк узнагароджвае Уладзіміра Борматава



Тацціяна Філімонава ўзнагароджвае Тацціяну Барабаншчыкаву

# Узнагароды — найлепшым

За значны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм і ў сувязі са святкаваннем Дня работнікаў культуры Падзяка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь абвешчана намесніку дырэктара па асноўнай дзейнасці Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е.Р. Раманава **Аляксандры Бураковай**, выкладчыку па класе ўдарных інструментаў Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Рыгора Шырмы **Мікалаю Нярэзьку**, дырэктару Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Нестара Сакалоўскага **Тацціяне Пузырэнка**, начальніку аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама **Наталлі Шыянок** і ўзорнаму **ансамблю танца "Дарунак"** Барысаўскай дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў.

За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у выхаванне моладзі Падзяка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь абвешчана дырэктару Лідскага дзяржаўнага музычнага каледжа **Алене Сераковай**.

За значны ўклад ва ўмацаванне міжнародных культурных сувязей і папулярызацыю беларускай нацыянальнай культуры Падзяка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь абвешчана **Рэспубліканскаму цэнтру нацыянальных культур**.

За шматгадовую плённую дзейнасць, значны ўклад у развіццё і папулярызацыю нацыянальнай культуры Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя начальнік аддзела культуры Полацкага райвыканкама **Алена Астапава** і дырэктар Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя Паўла Масленікава **Алена Баброва**.

За добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм і значны асабісты ўклад у развіццё і захаванне нацыянальнай культуры Падзяка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь абвешчана вядучаму майстру сцэны заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь імя Міхаіла Фінберга **Уладзіміру Ксёнцу**.

За шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні і папулярызацыі нацыянальнай культуры Падзяка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь абвешчана калектыву Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы.

За значны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм Падзяка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь абвешчана дырэктару Дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў горада Гомеля **Пятру Свірдлову**, дырэктару Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка **Марыне Чарнышовай** і **калектыву Магілёўскай абласной філармоніі**.

За значны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь узнагароджаны дырэктар — мастацкі кіраўнік Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь "Гродзенская капэла" **Уладзімір Борматаў**.

За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры і мастацтва нагрудны знак Міністэрства культуры ўручаны мастацкаму кіраўніку Цэнтра культуры "Віцебск" **Любові Аліярнік**, дырэктару Палаца культуры Магілёўскай вобласці **Ірыне Жаркоўскай**, намесніку старшыні Івацэвіцкага раённага выканкама **Святлане Завадскай**, выкладчыку Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў **Яніне Каваленка**, загадчыку сектара культуры аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Слуцкага райвыканкама **Алене Камоцкай**, начальніку ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама **Алене Клімовіч**, загадчыку гісторыка-краязнаўчага аддзела музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля **Ганне Кузьміч**, загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дызайну Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **Якаву Ленсу**, галоўнаму мастаку заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь "Беларускі дзяржаўны тэатр лялек" **Тацціяне Нерсісян**, загадчыку аддзела бібліятэчна-інфармацыйных тэхналогій інфармацыйнага цэнтра Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Жанне Рысевай**, майстру народных мастацкіх рамёстваў Адэльскага цэнтра культуры і народнай творчасці **Мар'яну Скрамблевічу** і загадчыку аддзела гісторыі партызанскага руху Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **Наталлі Яцкевіч**.

Ганаровай граматай Міністэрства культуры ўзнагароджаныя дырэктар Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча **Вераніка Вінель**, вядучы майстар сцэны Мінскага абласнога драматычнага тэатра **Тацціяна Карпец**, галоўны рэдактар рэдакцыі перыядычных выданняў і выданняў з працягам выдавецкага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Людміла Кірухіна**, дырэктар Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці **Кацярына Лабука**, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Свіслацкага райвыканкама **Ірына Паўлючэня**, намеснік дырэктара тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" **Аляксандр Смыслоў** і артыст балета вышэйшай катэгорыі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага Заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі" **Вольга Якавішана**.

За добрасумленную працу, высокі прафесіяналізм і ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў Ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя супрацоўнікі апарата Міністэрства культуры: намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў **Васілій Галаван** і кансультант аддзела кадравай работы і дзяржаўных узнагарод галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Наталля Дземянкова**.

Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь узнагароджаныя вядучы рэферэнт аддзела арганізацыйнай работы і дакументазвароту **Кацярына Андрэева**, начальнік аддзела бюджэтнага фінансавання фінансава-эканамічнага ўпраўлення **Тацціяна Афанасьева** і намеснік начальніка аддзела бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці **Лілія Чарноцкая**.

Граматай Міністэрства культуры за плённую дзейнасць па стварэнні прававых умоў для рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры ўзнагароджаныя намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнага заканадаўства Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь **Наталля Богдан**, начальнік аддзела метадалагічнага забеспячэння крыміналагічных экспертыз навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь **Алена Касьянава** і саветнік-кансультант аддзела па падрыхтоўцы законапраектаў і ўзаемадзеяння з Пастаяннай камісіяй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Сакратарыяту Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **Людміла Сарока**.

Падзяка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь абвешчаная кансультанту упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Яўгеніі Багдановіч**, рэферэнту аддзела арганізацыйнай работы і дакументазвароту **Вользе Зубавай** і кансультанту юрыдычнага аддзела **Аксане Краж**.

Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за добрасумленную плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, дасягнутыя поспехі ў навучанні і эстэтычным выхаванні дзяцей і моладзі ўзнагароджаны выкладчык Лідскага дзяржаўнага музычнага каледжа **Сяргей Бугасаў**, дырэктар Дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 19 горада Мінска **Наталля Ефіменка**, дырэктар Баранавіцкага дзяржаўнага музычнага каледжа **Тацціяна Нішкевіч**, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў **Вольга Палітыка** і дырэктар Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў № 7 **Дзмітрый Ткачонак**.

Падзяка Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за добрасумленную плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, дасягнутыя поспехі ў навучанні і эстэтычным выхаванні дзяцей і моладзі абвешчаная выкладчыку Мазырскага дзяржаўнага музычнага каледжа **Паўлу Чарнякову**.

Рашэннем Прэзідыума Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму прэмія ў намінацыі "Літаратура, журналістыка, крытыка" была нададзеная рэдактару аддзела культурнага жыцця Рэдакцыі газеты "Гомельскія ведамасці" **Дзмітрыю Чарняўскаму**, у намінацыі "Тэатральнае, экраннае, цыркавое мастацтва" — **Народнаму тэатру Краснапольскага раённага Цэнтра культуры Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Краснапольскага раёна**, у намінацыі "Жывапіс, скульптура, графіка, дызайн і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва" — бібліятэкару першай катэгорыі Лескаўскай сельскай бібліятэкі дзяржаўнай установы "Мінская раённая цэнтралізаваная бібліятэка" **Алене Каткоўскай**, у намінацыі "Народная творчасць" — Заслужанаму калектыву Рэспублікі Беларусь **Ансамблю танца, музыкі і песні "Белыя росы"**, у намінацыі "Бібліятэчная справа" — намесніку дырэктара Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна **Тацціяне Барабаншчыкавай**, у намінацыі "Музейная справа" — **Брэсцкаму абласному краязнаўчаму музею**.